Усевалад Сьцебурака



...ніхто так і не зьявіўся

па скарб...

# Габрэі вялейскіх ваколіцаў

***Галоўныя героі гэтых гістарычна-этнаграфічных абразкоў — беларускія габрэі з ваколіцаў маёй Вялейкі. У аснове гісторыяў расповяды чутыя ад маіх дзеда, бабулі, бацькі... Такім чынам, у большасьці – гэта сапраўдныя выпадкі з жыцьця ды трохі эмоцыяў, фантазіі і падсумаваньняў ад аўтара...***

## I. За царом

### *Піскляпё*

На Куранецкі кірмаш з вёскі Качанкі мужык нёс прадаваць пеўня. Певень выгадаваўся ладным птахам, што абяцала прынесьці гаспадару нядрэнны прыбытак.

Не пасьпеў селянін уладкавацца на месцы, як да яго падбег габрэй з хітрай мызай, які здалёк прыкмеціў добрую птушку і меў да яе не абы які інтарэс. Ён з налёту, каб не ўпусьціць здабычу, зьвярнуўся да мужыка з пагардлівым пытаньнем, з намерам зьбянтэжыць яго і зьбіць кошт: “*І колькі ж каштуе тваё піскляпё*?”

Гэта было фатальнаю памылкаю габрэя, бо дамогся ён зусім не

таго, на што разьлічваў. Абражаны селянін не разгубіўся і ня стаў пераконваць пакупніка ў якасьці тавару, а толькі разьюшыўшыся, узяў пеўня за ногі і пачаў лупіць ім, па чым трапляў, нахабнага габрэя. Той узьняў лямант і не на жарт зьляканы пабег шукаць ратунку ў пастарунак, адкуль у хуткім часе вярнуўся з паліцыянтам.

Калі яны разам падышлі да месца няўдалага гандлю, габрэй-ахвяра, хаваючыся за сьпінай прыстава, на выпадак паўторнае лупцоўкі пеўнем, з крыўдай у голасе прамовіў: "*Во, глядзіце, ён пабіў мяне гэтым бараном*!"

### *Хаім**

Гандляр жывёлай Хаім быў самым вялікім таўстуном сярод крывіцкіх габрэяў. Некалькі разоў на год ён абыходзіў ваколіцы мястэчка з мэтай дамовіцца аб набыцьці рознага быдла. Пад час такіх выправаў Хаім пры нагодзе з задавальненьнем спыняўся на начлег у хаце дзеда на хутары Субачы.

Хаім быў падкрэсьлена паважлівым у абыходжаньні і непатрабавальным госьцем. Пры гэтым у яго паводзінах меліся адметныя дробязі, якія не дзівілі дарослых, але выклікалі жывую цікавасьць у дзяцей.

На вячэру Хаім ласкава прасіў гаспадыню прынесьці яму кошык мытае бульбы, з якой, уважліва разгледзеўшы кожную, у рэшце выбіраў сабе штук пятнаццаць. Пасьля сам выкладаў бульбіны на вугольле ў печы. Наступнай яго аперацыяй быў выбар у якасьці абавязковае затаўкі дзьвюх цыбулінаў, якія Хаім не сьпяшаючыся адшукваў у вязанцы і, далікатна адшчапіўшы, клаў на стол. Да бульбы з цыбуляй ён дадаваў кавалак селядца, які прыносіў з сабой у дарожнай торбе.

Павячэраўшы, дзіўнаваты таўстун клаўся адпачываць, але заўсёды прасіў гаспадароў на ноч уладкавацца не на ложку, а на звычайнай лаве каля печы. Хаім-гандляр быў шчырым іўдзеям, які выконваў патрабаваньні сваёй веры нават у падарожжы, не зьвяртаючы на сябе лішняе ўвагі, не абцяжарваючы іншых і выказваючы падкрэсьленую павагу да іх.

### *Хейрым*

Кожную восень у майго прадзеда Міколы зьяўлялася прычына вельмі не любіць габрэяў. Падставай быў хейрым – таемная дамова яўрэйскіх гандляроў мястэчка, што ладзілася напярэдадні збору ўраджаю. Праходзіла яна ў сінагозе, што не супярэчыла іўдзейскай рэлігійнай традыцыі і разам з тым выключала любую магчымасьць пранікненьня на савет чужынца, які б парушыў планы падкагалка.

Нарада гэтая замацоўвала цьвёрдыя закупачныя кошты на ўсю сельскагаспадарчую прадукцыю, якую мясцовыя сяляне звозілі ў мястэчка на продаж. Вынікам хейрыму былі моцна заніжаныя расцэнкі, праз якія сяляне цярпелі нястачу, а габрэйскія гандляры мелі добры прыбытак на адным толькі перапродажы.

## II. За Польшчай

### *Пекар Кайзер*

На вялікім перапынку ў паўшэхную крывіцкую школу заходзіў габрэй з яткай сьвежых смачных піражкоў, да якой адразу зьбягаліся вучні. Тавар пекара Кайзера ведалі па мястэчку, і школяры з вялікай ахвотай куплялі цёплыя духмяныя піражкі. Каштавалі яны 5 грошаў, але ня ўсе мелі магчымасьць штодзень купляць такі ласунак. Некаторыя спрытныя хлопцы, каб не адмаўляць сабе ў асалодзе, даўмеліся абменьваць тавар пекара на курынае яйка, якое ранкам, употай ад маці, выбіралі з-пад курыцы. За недахопам гатоўкі ў малечы гаспадарлівы Кайзер згаджаўся на

---

*Хаім Кацовіч разам з вялікай сям'ёй загінуў пад час Халакосту.

такі натуральны абмен. тым больш, што яйкі пасьля адразу ішлі на прыгатаваньне наступнае партыі піражкоў, якія ізноў гэтак жа хутка раскупляліся.

Жыхары мястэчка яшчэ доўгія гады памяталі смак гэтых адмысловых вырабаў габрэйскага пекара, якія называлі “кайз*е*ркамі”.

## *Млынар Мендэль**

Па сьмерці маршалка Пілсудскага, пры якім габрэі пачувалі сябе досыць вольна, і ў польскай дзяржаве адчуўся подых дзяржаўнага антысемітызму. Аднак, крывіцкі кагал не зазнаў уяўнага ўціску ад мясцовага насельніцтва, калі не лічыць гісторыі з укінутай у фортку сінагогі варонай, што нарабіла вэрхалу пад час набажэнства і напалохала ціхіх местачковых іўдзеяў.

Габрэі па-ранейшаму вялі рэй у гандлі, трымалі заезныя дамы і корчмы, габрэйская капэла, як і раней, грала на ўсіх вясельлях, а іх млыны малолі ўсяму наваколью зерне. Адзін з такіх млыноў, што стаяў на маленькай рэчцы Наква, належаў Мендэлю. Мендэль лічыўся вельмі добрым майстрам, які ніколі не падводзіў з выкананьнем замовы. Калі ў ставе ад напружанае працы млына часам не хапала вады, гаспадар заводзіў рухавік, што працаваў на сырой нафце, і справа ішла далей.

Дакладна апоўдні з млыну даносіўся гучны паравы гудок, што сьведчыў пра няспынную працу механізму і заклікаў кліентаў.

На сьцяне млына, што глядзела на дарогу, тым часам зьявіўся плакат, на якім батлеечны габрэй сядзеў верхам на сьвіньні. Пад гэтай выявай вялікімі літарамі было напісана наступнае: “Бяры хварасьціну і гані жыда ў Палесьціну”.

## *Рэзьнічыха Сара***

Крама Сары-рэзьнічыхі была лепшай у мястэчку. Набыць там можна было ўсё ад цукерак да добрай англіцкай сукні. Акрамя таго Сара мела адметны, нават сярод габрэяў, гандлярскі талент.

Малому сыну аднаго заможнага селяніна, што, ідучы са школы, зазірнуў у яе краму, увішная гандлярка ласкава прапанавала замяніць яго просты палатняны заплечнік на новы скураны ранец з бліскучымі спражкамі. Пры гэтым яна не ўзгадала пра грошы, адпусьціўшы шчасьлівага і зьбянтэжанага хлопчыка.

Праз дзень да яе завітаў тата малога і напоўніцу аплаціў гатоўкай незапланаваны набытак сына.

Сара-рэзьнічыха добра ведала сумленнасьць мясцовых беларусаў.

## *Шынка для Моткі*

Паміж беларусамі і габрэямі складаліся з большага сяброўскія стасункі, праўда часам трохі дзіўныя.

Да прыкладу, мой прадзед Мікола, калі вэнджыў сабе сьвіныя кумпякі і кілбасы, заўсёды рабіў вэнджаную шынку па замове млынара Моткі Ходаса, які меў слабасьць да забароненае яго верай некашэрнае сьвініны. Прыгатаваную шынку загортвалі, клалі ў кошык і выпраўлялі з ёй на ровары малодшага сына Толю. Справа была асабістым сакрэтам паміж Моткам і прадзедам Міколам.

Калі Толюсь прывозіў Мотку шынку, малы млынароў сын Хевель, сьмешна картавячы, абзываў яго “музыком”. А Толя злазіў з ровару і, перахапіўшы ўпоперак, тыцкаў габрэйчыка галавой у стаў.

* Мендэлявы млын і хата добра захаваліся і дагэтуль.

** Муж Сары быў вядомым Крывіцкім рэзьнікам (рытуальным забойшчыкам жывёлы).

## III. За немцамі

### *Гімназістка Рыта*

З прыходам нямецкай акупацыі для мясцовага габрэйства надышлі сапраўды цяжкія часіны.

Ва ўмовах вынішчэньня габрэяў мясцовае насельніцтва, якое трымала заўсёдную дыстанцыю ў стасунках з імі, у большасьці сваёй зьмяніла стаўленьне на спачувальнае і пачало дапамагаць небаракам ўратавацца ад сьмерці.

У дзедавай сям'і на хутары Субачы некалькі месяцаў хавалася маладзенькая габрэйка Рыта. Яна жыла ў хаце разам з усімі, дапамагала ў сялянскай працы, гаспадыня выдавала яе за родную дачку. Калі аднойчы на хутар па нейкай патрэбе нечакана зайшлі нямецкія салдаты, Рыта вымушана стала перакладчыкам з нямецкай мовы, якой выдатна валодала. Паўстала пытаньне – скуль дзяўчына гэтак добра ведае па-нямецку, калі астатнія дзеці могуць казаць толькі па-польску. З небясьпечнае сітуацыі дапамагла выйсьці баба Ксеня, якая патлумачыла, што вучыла сваю разумную дачушку ў гімназіі ў Вялейцы, а астатнія скончылі толькі польскую пачатковую школку...

Са зьяўленьнем партызанаў рэшта ацалелых габрэяў пачала ратавацца ў лясах. Са ўсяго наваколья Халакост не закрануў бадай толькі дзьвюх прадстаўніц гаротнага народу – абедзьве жанчыны да вайны пабраліся шлюбам з беларусамі і прынялі хрысьціянства. Яны пражылі ўсю вайну на сваёй гаспадарцы, займаючыся часаньнем воўны.

### *Школьныя прыяцелі*

Здаўшы польскі прыймач па загадзе цывільнай нямецкае адміністрацыі, дзедава сям'я апынулася на хутары фактычна ў інфармацыйнай ізаляцыі. З тае прычыны старэйшы брат Яўціхій неяк выправіўся ў мястэчка па апошнія навіны.

Галоўнай навіной стала чутка пра хуткую зьнішчальную аперацыю ў Крывічах. На вуліцы Яўціхій выпадкова сустрэўся з адным са сваіх школьных знаёмцаў – габрэем Ёселем, які папрасіў часовага прытулку для сябе і сваіх сяброў, бо ім пагражала небясьпека патрапіць пад карніцкую чыстку. Яўціхій пагадзіўся дапамагчы і ноччу прывёў пяць чалавек на хутар. Яны праседзелі ў пуні сярод неабмалочаных снапоў жыта і аўсу трое сутак, покуль цягнуліся аблавы. Час ад часу нехта з сям'і пад выглядам гаспадарчае патрэбы хадзіў на ток і прыносіў хлопцам ежу. Так яны выратаваліся ад чарговае і пэўна не апошняе за вайну пагрозы сьмерці.

### *Перакладчык*

Увосень 1941 году немцы стварылі гета ў Княгініне. Насельнікі гета выкарыстоўваліся ў якасьці працоўнае сілы на пагрузцы лесу на станцыі і іншых цяжкіх работах. Крывіцкія габрэі ў большасьці загінулі пад час карнай акцыі ў красавіку 1942 году, калі іх, папярэдне аблiўшы бензінам, сагналі ў вялікае гумно на поплаве і падпалі. Мала каму пашчасьціла ўратавацца.

У княгінінскім гета былі габрэі з розных месцаў і ня толькі з Беларусі. Пры каменданце перакладчыкам быў габрэй таксама не мясцовы, і ён зьнешне болей выдаваў на арыйца, чым прадстаўніка семіцкіх народаў.

Жыў ён разам са сваім начальнікам у дамку пры гета. Аднойчы, скарыстаўшы чарговы моцны падпітак афіцэра, габрэй пераапрануўся ў яго вайсковую вопратку, начапіў партупею, кабуру з пісталетам, накінуў плашч і выйшаў у дажджлівую ноч. Ён без перашкодаў прайшоў на тэрыторыю гета, хаваючы твар пад капелюшом ад непагадзі. Адчайны перакладчык прапанаваў нявольнікам зьбегчы разам з ім. На прапанову адгукнулася толькі дзесяць чалавек. З імі ён выйшаў з гета і пакінуў паселішча і перад тым, як зьнікнуць канчаткова, разам са сваёй групай прыйшоў на хутар Субачы па Рыту.

### Ёсель-рызьнік

Першыя саветы зрабілі Ёселя афіцыйнай службовай асобай – служачым местачковае нарыхтоўчае канторы. Яму былі выдзеленыя вазок і конь. Цягаючыся па навакольлі з савецкай цыдулкай у кішэні старога лапсердака Ёсель займаўся тым жа, чым і раней – зьбіраў рызьзё.

З надыходам вайны ён не разгубіўся, а хутка ўклаўшы хатні скарб на калёсы, усадзіўшы сям'ю і навязаўшы да дыла казу, падаўся ў эвакуацыю. І дайшоў ён ні далёка ні блізка, а да самае Алма-Аты, перастрахаваўшыся ці не ўдвая і зрабіўшы на сваім гужавым транспарце недзе 4 тысячы кіламетраў.

Там у далёкай Азіі рызьнік усю вайну адпрацаваў "па сьпецыяльнасьці", а па перамозе, здаў каня з вазком пад расьпіску і вярнуўся з ацалелай сям'ёй і чыстым перад уладай сумленьнем на радзіму – у ціхае беларускае мястэчка, дзе за праяўленую пільнасьць і сьвядомасьць пры захаваньні сацыялістычнае маёмасьці быў прызначаны старшынём сельсавету.

## IV. За Саветамі

### Пры пасадзе

На сытай і пачэснай пасадзе Ёсель прабыў некалькі год і папрасіўся на іншую працу. Калі яго знаёмыя, дужа зьдзіўленыя гэтым рашэньнем, пыталіся пра прычыны, што вымусілі кінуць такое цёплае месца, былы рызьнік адказваў прыкладна так: *"Ой, вы ведаеце, я працаваў на такой шкоднай працы. У мяне ўвесь час балела шыя. Як я ішоў па мястэчку, то ўсе віталіся, і я мусіў ім ківаючы адказваць: "Здрасьце! Здрасьце!".*

### Вяртаньне кабылкі

Пасьля вызваленьня Беларусі ў Крывічы вярнуліся ў сваю хату толькі дзьве Рыціны сястры, а сама яна загінула падчас блакады партызанскае зоны. Дзедава сям'я дапамагала ім па магчымасьці харчамі, хаця тым часам і сама ўжо не была заможнай.

Калі Чырвонае войска зрэквізавала ў дзеда адзіную кабылу на патрэбы фронту, сярэдняя Рыціна сястра Люба, што працавала ў адной з дзяржаўных установаў мястэчка, пайшла да адказнага начальніка і здолела дамовіцца пра вяртаньне жывёлы гаспадарам. Маладую і ладную кабылку выбракаваў ветэрынар, нібы знайшоўшы сур'ёзную хваробу.

Увесну 1945 году гэтай кабылай дзед пераараў агарод Любы і засадзіў яго сваёй бульбай.

Праз год сёстры ад'ехалі ў Палесьціну будаваць сваю дзяржаву.

### Габрэйскае золата

Дагэтуль на месцах габрэйскіх камяніцаў аскомлівыя на чужое багацьце людзі ўсялякімі шляхамі шукаюць прыхаваныя скарбы. Але мала хто насамрэч трымаў у сваіх руках, здабытае такім шляхам золата...

Мікіта жыў у апошнім дамку на вуліцы, што межавала з габрэйскім канцом мястэчка. Па жыцьці ён быў чалавекам праўдзівым ды разважлівым, ставіўся да людзей так, як яны таго заслугоўвалі, не падзяляючы іх на рускіх, палякаў ці жыдоў. Адносіны з суседзямі-іншаверцамі не былі нейкімі адметнымі, але роўнымі і ўзаемапаважлівымі ды і ні чым асаблівым не праяўляліся. Да часу. А дакладней да другой Сусьветнай вайны, калі над габрэямі навісла пагроза гвалтоўнага перасяленьня ў гета.

Божы народ на сваім вяку зьведаў безьліч бедаў і спадзяваўся з дапамогай

Усявышняга перажыць і гэтую, а праз тое клапаціўся пра будучыню, якая магла быць цяжкай, але ўсё ж мусіла чакаць тых, каму больш пашанцуе.

Так да Мікіты аднойчы зайшоў стары шляхетны габрэй, галава вялікае сям'і, і, распачаўшы сваю гутарку словамі: *"Ты ведаеш нас, мы ведаем цябе"*, парасіў суседа пагадзіцца схаваць іх скарб у сваёй хаце на час фашыстоўскае навалы. Мудры стары, атрымаўшы згоду, паставіў яшчэ адну прынцыповую ўмову захоўваць некранутым багацьце 10 гадоў і аддаць іх любому з іх радзіны, старому ці малому, хто здолее вярнуцца жывым. Згодна дамове Мікіта чакаў вызначаны час, але ніхто так і не зьявіўся па скарб. Ня маючы больш абавязкаў, новы гаспадар скарыстаў грошы сам*.

### *Старшыня Міранові́ч.*

Доўгі час саўгас "Любань" узначальваў габрэй Міранові́ч**. На пасаду начальніка буйной гаспадаркі яго вывела савецкая партызанка, якая ў тым часе была вядомай кузьняй кіраўнічых кадраў партыйнае вертыкалі ад кіраўніка калгасу да Першага сакратара ЦК КПБ.

Мірановіч быў ня толькі старым партызанам, ён быў дэпутатам саветаў усіх узроўняў у тым ліку і Вярхоўнага Савету СССР. Ня трэба тлумачыць, што ён меў вялікія магчымасьці, але дзіўна тое, што магчымасьці гэтыя ён скіроўваў на карысьць сваёй гаспадаркі і найперш людзей.

У яго моцным саўгасе апроч звыклых палеткаў і кароўніка меліся сьпіртзавод, кансервавы завод, дагледжаныя сады і агароды, гадаваліся авечкі, выраблялiся нават выдатныя кажухі. Пры гэтым усім сам пасьпяховы старшыня ня быў запанелым апаратчыкам, прагнілай да таго часу ўшчэнт сістэмы, а зьяўляўся хутчэй выняткам з яе.

Абуўшыся ў керзавыя боты і ватоўку, Мірановіч абыходзіў сваю гаспадарку ў любы час – хоць у дзень, хоць уначы. Аднойчы ён сустрэў на градах жанчыну, што цягнула непад'ёмныя мяхі памідораў і зьляканая аслупянела, пабачыўшы начальніка. Той лагодненька зьвярнуўся да зладзейкі: *"Ну? Што ж ты робісь? Зусім сябе не шкадуесь! Ты ж надарвесься. Ты прыходзь заўтра – я табе выпішу 5 кіляў, ты вазьмі 50, але прыедзь удзень і на возе!"*

Падобным чынам ушчуваў Мірановіч і свайго загадчыка складам, што ўночы пёр цяжка сапучы скрыню цьвікоў: *"Хто ж так крадзе? Цябе ж пасадзяць! Ты козны дзень бяры па зьмені ў кішэню і будзе ўсё добра!"*

Яго далікатнасьць і мяккасьць, за якімі хаваліся гаспадарская хватка і розум, узьдзейнічалі на людзей лепш за мацюкі і пагрозы. Праз гэта Мірановіча шчыра паважалі.

Ён жыў і даваў жыць іншым. На вясельлі, провады, ды юбілеі старшыня выпісваў за капейкі мяса, пітво ды гародніну і ў дадатак дазваляў гуляць сьвяты ў шыкоўнай двухпавярховай саўгаснай сталоўцы. Пры ім у вёсцы заставалася моладзь, будаваліся дамы і мелася нават свая музычная школка.

Са сьмерцю старшыні паступова развалілася вялікая гаспадарка, няма авечак і даношваюцца апошнія кажухі, адно засталіся шматлікія байкі пра дасьціпнага і дабразычлівага старога габрэя Мірановіча.

---

*Золата дазволіла Мікіту вывучыць яго чатырох сыноў, якія сталі адпаведна сьвятаром, інжынерам, настаўнікам і доктарам.

** Сапраўднае прозьвішча Фількенштэйн